ISSN 2077-4885

# НАУЧНЫЕ ТРУДЫ

## Республиканского института высшей школы

*Исторические и психолого-педагогические науки*

Сборник научных статей

Основан в 2000 году

Выпуск 17

В трех частях
Часть 2

Минск
РИВШ
2017

УДК 082

В сборник, включенный ВАК Республики Беларусь в перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований, вошли статьи по историческим и психолого-педагогическим наукам.

Адресован аспирантам, научным работникам, преподавателям высшей школы.

Рекомендовано
редакционно-издательской комиссией
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 6 от 27 декабря 2016 г.)

Редакционная коллегия:
пред. редкол., д-р физ.-мат. наук проф. *В. А. Гайсёнок;*
д-р филос. наук проф. *В. Ф. Берков;* д-р ист. наук доц. *Г. Я. Голенченко;*
д-р ист. наук проф. *В. С. Кошелев;* д-р филос. наук проф. *В. В. Позняков;*
д-р филос. наук проф., чл.-кор. НАН Беларуси *П. А. Водопьянов;*
д-р пед. наук проф. *В. Ф. Володько;* д-р пед. наук проф. *В. В. Чечет;*
д-р психол. наук проф. *И. А. Фурманов;* д-р психол. наук проф. *В. А. Янчук;*
д-р экон. наук проф. *А. В. Данильченко;* д-р экон. наук проф. *В. А. Воробьёв;*
д-р полит. наук проф. *В. А. Мельник;* д-р ист. наук проф. *О. Г. Слука;*
д-р полит. наук, проф. каф. политологии *Л. Е. Земляков*

© ГУО «Республиканский
институт высшей школы», 2017

*М. В. Цуба*
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, Пінск

*M. Tsuba*
Polesye State University, Pinsk

**УДК 947.6(=411.6)«1914/1916»**

# ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК У ПІНСКУ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

# PERIODICALS IN PINSK DURING WORLD WAR I

*У артыкуле на аснове матэрыялаў перыядычнага друку часоў Першай сусветнай вайны раскрываюцца падзеі гэтага перыяду, якія мелі месца ў горадзе Пінску. У дадзеным матэрыяле прадстаўлены аналіз публікацый у газетах, што выдаваліся царскімі, германскімі і бальшавіцкімі ўладамі.*

*Ключавыя словы: перыядычны друк; Першая сусветная вайна; камендатура; рэдактар; Пінская газета.*

*This article is based on periodicals press during World War I. It shows events that occurred in Pinsk. This material represent analysis of publications in newspaper which were published by tsar's, German's and Bolshevik's authorities.*

*Key words: periodicals; the First World War; the commandant's office; the editor; Pinsk newspaper.*

Вывучэнне перыёдыкі, што выдавалася ў Пінску ў перыяд Першай сусветнай вайны і асвятленне на яе старонках падзей гэтай вайны з'яўляецца адной з актуальных, але амаль нераспрацаваных праблем. Малалікасць літаратуры па дадзенай тэматыцы можна растлумачыць наступным: з пачаткам вайны, і ўвядзеннем ваеннага становішча ў беларускіх губернях выпуск газет, часопісаў, асабліва ў павятовых гарадах, альбо рэзка скараціўся, альбо ўвогуле быў спынены; акрамя таго, часта прадузятыя адносіны да падзей, што мелі месца да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., у савецкі час вялі да непапулярнасці вывучэння тых ці іншых аспектаў Першай сусветнай

вайны, у тым ліку і перыёдыкі, што выдаваліся пры царскай уладзе альбо пры акупацыйнай. Бясспрэчна, як царскія, так і германскія акупацыйныя, а таксама і бальшавіцкія ўлады падчас вайны праследавалі на нашых землях у першую чаргу свае інтарэсы, што наглядна адлюстравана ў іх перыядычных выданнях. Але праз прызму гэтых інтарэсаў у газетных артыкулах праглядваюцца жыццё і клопаты пінскіх мяшчан, іх заняткі, побыт, настрой, вераванні, звычаі, традыцыі і г. д.

1 жніўня 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна. У гэты ж дзень у Пінску, які ўваходзіў у склад Мінскай губерні, з'яўляецца распараджэнне мінскага губернатара аб увядзенні ваеннага становішча. Адначасова пінчане з газет даведаліся, што пачалася мабілізацыя па ўсёй губерні. У першыя дні вайны конная паліцыя развязла па горадзе і яго ваколіцах мабілізацыйныя павесткі. Фактычна ўсе дзяржаўныя ўстановы ў Пінску былі ўпрыгожаны каляровымі мабілізацыйнымі плакатамі.

Адразу пад строгі кантроль уладай быў узяты перыядычны друк і культурныя ўстановы. Насельніцтву забараняўся тут усялякі продаж газет і часопісаў без дазволу вайсковага начальства [1, с. 596]. Змест перыядычнага друку павінна была вызначаць папярэдняя ваенная цэнзура, якая часта здымала з выдання шматлікія публіцыстычныя артыкулы. У выніку чаго газеты нярэдка выходзілі з белымі плямамі. Непадпарадкаванне ўведзеным цэнзурным правілам строга каралася. Напрыклад, ужо на пачатку вайны па ўказанні ўрадавага Сената «…ўтрымальнік друкарні альбо друкарскіх установ ці кіруючы гэтым, вінаваты ў надрукаванні атрыкула, без дазволенага подпісу ваеннай цэнзуры, альбо ў сувязі з заменай таго зместу, што дазволіла ваенная цэнзура», падвяргаўся грашоваму спагнанню ад 2500 да 3000 рублёў ці заключэнню ў турму ад 2 тыдняў да 3 месяцаў [2].

Газеты, якія ўяўлялі хоць нейкую апазіцыйнасць ураду, падлягалі закрыццю, у лепшым выпадку падвяргаліся судовым спагнанням і нападкам, у час якіх канфіскоўваліся асобныя нумары ці выходзілі з перапынкамі. Не дзіўна, калі ў такіх умовах у Пінску дайшло да таго, што пад рэдакцыяй С. Глаўбермана і С. Вальковіча ўсяго толькі перавыдаваліся сталічныя газеты-плакаты «Телеграммы Петроградского телеграфного агентства» і «Последние новости Петроградского агентства». У дадзеных газетах перадрукоўваліся зводкі з франтоў баявых дзеянняў, якія даволі часта давалі супярэчлівыя звесткі аб поспехах ваюючых бакоў, але адсутнічала ўсялякая мясцовая інфармацыя. Улічваючы патрэбнасць пінскай грамадскасці ў выданні сваёй мясцовай газеты і адносна спакойныя абставіны грамадска-палітычнага жыцця ў горадзе, ваеннае ведамства вырашыла дазволіць выпуск газеты пад назвай «Объединение: Газета Полесья». Рэдактарам-выдаўцом дадзенай газеты быў прызначаны М. А. Міхальскі, а газета павінна была мець распаўсюджванне па ўсім Заходнім Палессі [3, с. 166].

Маючы на мэце пашырэнне мясцовага матэрыялу, газета час ад часу падымала пытанні эканамічнага характару: «Вясной гэтага года распачнуцца

асушальныя работы ў 25-ці месцах. Абводныя і пошукавыя работы будуць адбывацца на плошчы 33 460 дзесяцін. На гэтыя расходы выдзелена з казны 170 000 рублёў. Львіная доля расходаў прыпадае на Пінскі павет», альбо: «Нягледзячы на ваенны час, група віцебскіх капіталістаў прапаноўвае распачаць перамовы аб прадастаўленні ім канцэсіі на ўсталяванне у Пінску электрычнага асвятлення. Ёсць прапанова адразу па атрыманні канцэсіі пачаць ладзіць пабудову і вясці працу па абсталяванню электрычнай станцыі» [4].

Неабходна адзначыць, што газета звяртала пільную ўвагу на культурнае жыццё пінчан. З нумара ў нумар друкаваліся аб'явы аб чытанні лекцый на ваенную тэматыку, змяшчаліся паведамленні аб гастролях артыстаў, публікавалася рэклама аб канцэртах, дэманстрацыі фільмаў і г. д.

Аднак тэатр ваенных дзеянняў набліжаўся да Пінска. У газеце паведамляецца аб прызыве на ваенную службу пінчукоў, а таксама аб некаторых прафілактычных мерах па вывазу з горада асоб чужаземнага паходжання, асабліва немцаў. Прычым мноства нямецкіх каланістаў было вывезена па чыгунцы за асабістыя грошы пад канвоем паліцэйскіх стражнікаў у глыб Расійскай імперыі [5]. На старонках газеты ўсё часцей змяшчаюцца заметкі аб зборы ахвяраванняў для дапамогі тым, хто пацярпеў ад вайны, як, напрыклад: «На пряцягу тыдня, з 10 па 17 мая, у Пінску ва ўсіх сінагогах і малітвенных дамах адбудзецца талерачны збор сярод прыхажан на карысць камітэта Вялікай княгіні Таццяны Мікалаеўны» [6]. Тым часам подых вайны ўсё мацней адчуваўся  ў Пінску. Гэты перыяд характарызаваўся непазбежнымі, звязаннымі з вайной парушэннямі паўсядзённага цячэння жыцця, чаргаваннем розных падзей і ваганнямі грамадскага настрою. Непасрэднае прыбліжэнне фронту выразна адлюстроўвалася  ў такіх артыкулах «Объединения», як «Прыбыццё параненых» і «Збудаваная царква». У першым пазначана, што «29 красавіка праз станцыю Пінск праследавалі на цягніках 1000 параненых, якія эвакуіраваліся ў іншыя гарады. Некалькі сотняў чалавек былі астаўлены ў Пінску і размешчаны ў мясцовыя шпіталі». У другім паведамлялася: «На праваслаўных брацкіх могілках, на сродкі ваеннага фонда, пабудавана прыгожай архітэктуры часовая драўляная царква... У царкве знаходзіцца мрамарная дошка, на якой залатымі літарамі запісваюцца імёны загінуўшых герояў, пахаваных на брацкіх могілках» [7].

Але гінулі людзі не толькі ад куль. Голад, розныя хваробы, асабліва халера, пры гэтым адсутнасць належнай медыцынскай дапамогі касілі людзей не менш, чым зброя. У выніку ў некалькіх нумарах газеты «Объединение» распавядаецца аб захворванні гараджан халерай і аб смяротных выпадках ад яе [8]. Пэўныя меры па барацьбе з халерай, бясспрэчна, мелі месца, але яны з'яўляліся капляй у моры для вялікай колькасці захварэўшых людзей. Чытаем аб гэтым наступнае: «… адбылося першае засяданне створаннай пры павятовай земскай управе санітарна выканаўчай камісіі ў сувязі з аб'явай у Мінскай губерні пагрозы ад халеры. На засяданні вырашана пабудаваць

пры Пінскай земскай бальніцы халерны барак на 25 ложкаў. Вызначана заснаваць у Пінску лятучы атрад» [9].

Асабліва пагоршылася становішча на Піншчыне ў сувязі з адступленнем расійскіх войск летам – восенню 1915 года, якое суправаджалася масавым, часта прымусовым бежанствам дзясяткаў тысяч людзей на ўсход. Жудасную інфармацыю гэтага часу чытаем у тэлеграме мінскага губернатара ўрачу А. Гаўлоўскаму: «Паступаюць звесткі аб непрыбранных на дарогах трупах памёршых галоўным чынам ад халеры. Прыміце меры да прыдання зямлі памёршых» [10]. Сотні невядомых магіл пакінулі пасля сябе на Піншчыне шматкіламетровыя абозы бежанцаў. Да таго ж, як сведчыць інфармацыя з газеты «Объединение», гэтых нясчасных людзей мясцовыя ўлады выкарыстоўвалі разам з ваеннапалоннымі на розных земскіх работах па ўмацаванню абароназдольнасці пінскага рэгіёну: «У цякучы перыяд адчуваецца вялікі недахоп у чарнарабочых… Пінская павятовая земская ўправа хадатайнічае перад начальнікам губерні аб дазволе управе выкарыстоўваць працу ваеннапалонных і бежанцаў для выканання неадкладных земскіх работ. Управа жадае выкарыстаць працу 100 ваеннапалонных і 300 бежанцаў» [11].

Аднак, нягледзячы на ўсе прынятыя царскімі ўладамі меры, 15 верасня 1915 года германскія войскі ўступілі ў Пінск. Кайзераўскія акупацыйныя ўлады адразу пачалі ўводзіць свае парадкі. Галоўнай іх мэтай з’яўлялася выкачаць як мага больш матэрыяльных каштоўнасцяў з акупіраваных тэрыторый на карысць Германіі. А для таго, каб арганізаваць мясцовае насельніцтва для выканання сваіх распараджэнняў і трымаць сітуацыю пад кантролем, было вырашана наладзіць выданне сваёй газеты. Такім чынам, у горадзе пачала выходзіць штодзённая двухмоўная (на нямецкай і расійскай мовах) газета пад назвай «PINSKER JEITUNG. Пинская газета». Адказным рэдактарам гэтай газеты акупацыйнымі ўладамі быў прызначаны А. Фрайслер. Дадзеная газета з’яўлялася друкаваным органам пінскай камендатуры. Па загаду гэтай акупацыйнай установы «PINSKER JEITUNG. Пинская газета» павінна была распаўсюджвацца ва ўсіх гасцініцах і гандлёвых кропках горада.

Рубрыка «PINSKER JEITUNG. Пинскай газеты» складалася з розных паведамленняў мясцовага характару, а таксама з абмеркавання і аналізу ваенных дзеянняў з розных тэатраў Першай сусветнай вайны з пункту гледжання германскіх акупацыйных улад.

Усе газетныя нумары былі запоўнены рознымі аб’явамі, папярэджваннямі, загадамі і распараджэннямі пінскай камендантуры, як, напрыклад: «Усе рэчы, альбо часткі рэчаў з жоўтай медзі, волава, цынка, чырвонай медзі, бронзы, алюмінія і нікеля (гэта значыць самавары, катлы, ванны, кубшыны, ручкі дзвярэй, абшыўкі і г. д.) лічацца пад арыштам і на іх павінны быць пададзены заявы ў камендантуру.

Гэтыя прадметы па неабходнасці будзе купляць ваеннае ўпраўленне за налічныя грошы… тых хто не напіша заяву альбо схавае гэтыя рэчы чакае пакаранне грашовым штрафам альбо арыштам». У гэтым жа нумары газеты паведамляецца таксама, што «з 38-га па 31 мая 1917 г. (за выключэннем святочных дзён) мясцовы склад сырых матэрыялаў, вул. Брэсцкая, 47, купляе ў жыхароў скуры і кожы за налічныя грошы… Непрададзеныя скуры да 1 чэрвеня 1917 г. лічацца пад арыштам і за іх канфіскацыю выплата грошай не прадугледжана» [12].

Недахоп у таннай рабочай сіле адчувалі не толькі царскія, але і германскія акупацыйныя войскі. У інтэрэсах Германіі нямецкія акупацыйныя ўлады рабілі ўсё магчымае дзеля прымянення жорсткай працоўнай эксплуатацыі ў дачыненні да мясцовых людскіх і прыродных рэсурсаў.

Аднак па дадзеным пытанні іх падыходы былі не толькі прымусовыя, але і прымяняліся метады заахвочвання.

Улічваючы перабоі і цяжкасці забеспячэння пінчан харчаваннем, падчас вайны акупацыйныя ўлады закрывалі найбольш танныя рабочыя сталовыя і магазіны для таго, каб жыхары горада, спасаючыся ад голаду, працавалі на іх. За гэта з імі прадстаўнікі германскай камендантуры разлічваліся прадуктамі харчавання, аб чым чытаем наступнае: «24 лютага с. г. зачыняецца да гэтага часу дзейнічаючая па вечарах пры яўрэйскай народнай кухні рабочая сталовая. У сувязі з чым забеспячэнне харчаваннем рабочых адбываецца наступным чынам: – Рабочыя, якія запісаны ў працоўны спісак камендантуры, забяспечваюцца прадуктамі харчавання вайсковымі фарміраваннямі, пры каторых яны працуюць, альбо камендантурай, г. зн. пастаянныя рабочыя – ва ўсе рабочыя дні, а непастаянныя ў тыя дні, калі яны працуюць». Тут жа ў мэтах працоўнай павіннасці друкуецца патрабаванне, каб «усе дзяўчата горада ўзросту ад 16 да 35 гадоў, а таксама ўсе жанчыны, якія не маюць мужа і дзяцей гэтага ж узросту, павінны з’явіцца ў камендантуру пры сабе маючы расійскія дакументы, такія як пашпарт, метрычнае пасведчанне і г. д… Хто не з’явіцца ў пазначаны час, альбо ўвогуле ўхіліцца ад явачнай павіннасці, будзе падвергнуты грашоваму штрафу ці арышту, а пры пэўных абставінах высылцы з горада» [13].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на Піншчыне ўсё больш пачаў праяўляцца ўплыў бальшавікоў. У кастрычніку 1918 г. пачалося Палескае паўстанне ў тыле ворага, якое амаль поўнасцю ахапіла Пінскі і Ровенскі паветы. Для ўзняцця патрыятычнага настрою і культурнага ўзроўню ўдзельнікаў паўстання прыехаўшымі сюды бальшавіцкімі прадстаўнікамі ладзіліся выступленні лектараў-прапагандыстаў з дакладамі, а таксама праводзіліся масавыя чытанні прывезеных з Масквы газет. Бачачы, якое вялікае значэнне для ўмацавання баявога духу маюць падобныя мерапрыемствы, яны вырашылі стварыць сваю мясцовую, падпольную газету «Лесное эхо». Удзяляючы вялікую ўвагу прапагандысцкім метадам работы сярод мясцовага насельніцтва, паўстанцы пад кіраўніцтвам бальшавікоў

з дапамогай дадзенай газеты заагітавалі найбольш актыўных прадстаўнікоў тутэйшага насельніцтва і прыцягнулі іх у свае шэрагі. Вядома, што членамі рэдакцыйнай калегіі гэтай газеты з'яўляліся даволі славутыя бальшавіцкія дзеячы Ф. А. Казубоўскі, Р. М. Астроўскі, М. В. Вішнеўскі, Ф. І. Рамановіч, А. Ф. Растаргуеў, К. Ф. Русак, А. С. Кароль [14, с. 221].

Газета «Лесное эхо» ў той час з'яўлялася фактычна асноўным інфармацыйна-прапагандысцкім органам бальшавікоў у нашым краі і мела распаўсюджванне не толькі на істотнай частцы Палесся – Піншчыне, але і ў самім горадзе Пінску.

Такім чынам, падчас Першай сусветнай вайны кожны з супрацьборствуючых бакоў, улічваючы вялікую ролю прапагандысцкай работы сярод народных мас, надаваў істотную значнасць у гэтым кірунку свайму друкаванаму органу, сваёй газеце. Газета павінна была праводзіць агітацыйную працу – друкаваць абавязковыя для выканання розныя распараджэнні ў інтарэсах тагачасных уладаў. Кожны з бакоў часта супярэчліва з свайго пункту гледжання трактаваў тыя ці іншыя падзеі, што адбываліся ў Пінску і на Піншчыне. Тым не менш на газетных старонках падавалася інфармацыя пра тую ці іншую для нас невядомую акалічнасць. Прыводзіліся статыстычныя дадзеныя, лічбы, факты, якія мелі месца ў даследуемы перыяд і дайшлі да нас. А гэта ўсё станоўчыя моманты для сённяшняга вывучэння і аналізу падзей таго часу. Маючы дадзены матэрыял у перыядычных выданнях, лягчэй правільна асэнсаваць змест мінулага.


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). – 688 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ.)– Фонд 1416. – Воп. 1. – Спр. 2355. – Арк.4.
3. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. – Мінск: БЕЛТА, 1998. – 557 с.
4. Осушка болот. Да будет свет // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 25 апр.
5. НАРБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 8982. – Арк. 1; 2; 6; 11.
6. Тарелочный сбор в синагогах // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 1 мая.
7. Прибытие раненых. Выстроена церковь // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 1 мая.
8. Холера наступает // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 18 июля.
9. Против холеры – летучий отряд // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 3 июля.
10. НАРБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 8989. – Арк. 168.
11. Дело есть, рабочих нет // Объединение: Газета Полесья. – 1915. – 19 июля.
12. Объявления // PINSKER JEITUNG. Пинская газета. – 1917. – 7 мая.
13. Объявления // PINSKER JEITUNG. Пинская газета. – 1917. – 24 фев.
14. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лунінец. р-на. – Мінск: Беларусь, 1995. – 716 с.


**(Дата падачы: 20.02.2017 г.)**

# СОДЕРЖАНИЕ

## ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

*Сидорова С. О.* МИНСКИЙ ПОЧТОВО-ТЕЛЕГРАФНЫЙ ОКРУГ НА РУБЕЖЕ XIX–XX ВВ. .......... 3

*Синковец А. Ю.* ВЕРХОВНЫЕ ГЛАВНОКОМАНДУЮЩИЕ РОССИИ И ИХ ВОСПОМИНАНИЯ О СОБЫТИЯХ В СТАВКЕ (1914–1918 ГГ.) .......... 11

*Стахно Н. В.* АСЭНСАВАННЕ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ Ў МЕНТАЛІТЭЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ XVII СТАГОДДЗЯ .......... 24

*Стволыгин К. В.* ПОЛИТИКА РЕВОЛЮЦИОННОГО ВОЕННОГО СОВЕТА РЕСПУБЛИКИ В ОТНОШЕНИИ ОСВОБОЖДЕНИЯ ОТ ВОИНСКОЙ ПОВИННОСТИ ПО РЕЛИГИОЗНЫМ УБЕЖДЕНИЯМ ГРАЖДАН РСФСР (1918–1922 ГГ.) .......... 31

*Сыцько К. В.* ДАКУМЕНТЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НА БЕЛАРУСІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ) .......... 38

*Телепень С. В.* ВОЕННАЯ И АДМИНИСТРАТИВНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАК ФАКТОР ИДЕНТИЧНОСТИ НОБИЛИТЕТА РИМСКОЙ ИМПЕРИИ .......... 45

*Теслюкевич Д. И.* БЕЛОРУССКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1920-е ГГ. ПО МАТЕРИАЛАМ БЕЛОРУССКОЯЗЫЧНЫХ СМИ .......... 52

*Толочко Д. М.* ПОЛЬСКИЙ ПОХОД КРАСНОЙ АРМИИ В СЕНТЯБРЕ 1939 ГОДА В ОЦЕНКАХ СОВЕТСКИХ ЛЮДЕЙ .......... 58

*Трестьян И. Н.* ИНСТИТУТ ВОЕННОГО ГУБЕРНАТОРСТВА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (1796–1823 ГГ.) .......... 65

*Филиппов А. А.* КОНЦЕПЦИЯ ИСТОРИИ В ГОСУДАРСТВЕ БАХРИТСКИХ МАМЛЮКОВ В ЕГИПТЕ (1250–1382) .......... 72

*Хованский В. М.* ФОРМИРОВАНИЕ СИСТЕМЫ ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ В ВООРУЖЕННЫХ СИЛАХ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ПЕРИОД 1991–1994 ГГ. .......... 78

*Цуба М. В.* ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК У ПІНСКУ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ .......... 86

*Цумарева Е. П.* ВЛАСТЬ И ПРЕССА В РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В 1905–1914 ГГ. (НА ПРИМЕРЕ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ) .......... 92

*Цымбал А. Г.* «КРЭСОВАЯ» ПАРАДЫГМА Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ: ЭВАЛЮЦЫЯ МІФА І ДАСЛЕДЧЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ .......... 100

*Шимукович С. Ф.* УЧАСТИЕ БЕЛОРУССКИХ РЕГИОНАЛЬНЫХ ЭЛИТ В РЕАЛИЗАЦИИ БЛАГОТВОРИТЕЛЬНЫХ ИНИЦИАТИВ ЧЕРЕЗ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ МЕСТНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ РОССИЙСКОГО ОБЩЕСТВА КРАСНОГО КРЕСТА В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА ........ 108

*Яковчук В. И.* ОРГАНИЗАЦИЯ КОНТРОЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В СИСТЕМЕ ГОСУДАРСТВЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ ........ 116

*Янушевич И. И.* ИНФОРМАЦИОННО-ПРОПАГАНДИСТСКОЕ СОПРОВОЖДЕНИЕ АНТИРЕЛИГИОЗНОЙ РАБОТЫ В СОВЕТСКОМ ГОСУДАРСТВЕ В 1919–1941 ГГ. (НА ПРИМЕРЕ БССР) ........ 124

**ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ**

*Андрущенко Н. Ю.* КУРС «ИСТОРИЯ СОЦИАЛЬНОЙ ПЕДАГОГИКИ» В ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКЕ БУДУЩИХ СОЦИАЛЬНЫХ ПЕДАГОГОВ ........ 131

*Антоненко А. Н., Толкачев Е. А.* МЕТОДИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ РЕАЛИЗАЦИИ ЕСТЕСТВЕННОНАУЧНОГО КОМПОНЕНТА В ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ПРОГРАММАХ ПОВЫШЕНИЯ КВАЛИФИКАЦИИ И ПЕРЕПОДГОТОВКИ ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ ........ 139

*Григорьева О. Н.* РАЗВИТИЕ ДЕОНТОЛОГИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ ПЕДАГОГА В СИСТЕМЕ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ВЗРОСЛЫХ ........ 145

*Гуртовая Е. Ю., Курбыко З. С., Макаренко Э. Н.* САМООЦЕНКА КАК МЕХАНИЗМ ОБЕСПЕЧЕНИЯ ПРОЗРАЧНОСТИ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УНИВЕРСИТЕТА ........ 152

*Игнатович Е. С., Козлов Е. А.* ПРОФОРИЕНТАЦИОННАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАК СРЕДСТВО ПОВЫШЕНИЯ КАЧЕСТВА ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ В ВЫСШЕЙ ШКОЛЕ (НА ПРИМЕРЕ ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА) ........ 159

*Кранцевич Н. М.* ПРИНЦИПЫ ФОРМИРОВАНИЯ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ТРАЕКТОРИИ СТУДЕНТОВ-ИНОСТРАНЦЕВ ........ 167

*Краснова Т. И., Егорова Ю. Н.* ДИЗАЙН ПРОЦЕССА ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКИ ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ НА ОСНОВЕ ПРИНЦИПОВ КОМПЕТЕНТНОСТНОГО ПОДХОДА ........ 173

*Лозицкий В. Л.* ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ДИДАКТИЧЕСКОГО ПОТЕНЦИАЛА ЭЛЕКТРОННЫХ УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКИХ КОМПЛЕКСОВ В ОРГАНИЗАЦИИ ПРОЦЕССА ОБУЧЕНИЯ НА ВТОРОЙ СТУПЕНИ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ В ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННОЙ МАГИСТРАТУРЕ (НА ПРИМЕРЕ ЭУМК ПО УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЕ «ПЕДАГОГИКА И ПСИХОЛОГИЯ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ») ........ 179

*Лойко О. Л.* ФОРМИРОВАНИЕ КУЛЬТУРЫ ЗДОРОВОГО ОБРАЗА ЖИЗНИ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ: ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ ПОДХОДЫ И ПРАКТИЧЕСКИЕ РАЗРАБОТКИ ........ 187

*Луговская А. В.* МЕТОДИЧЕСКИЕ УСЛОВИЯ ЭФФЕКТИВНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ УЧЕБНО-ТРЕНИРОВОЧНОГО ПРОЦЕССА СПОРТСМЕНОВ ВЫСШЕЙ КВАЛИФИКАЦИИ В ЦИКЛИЧЕСКИХ ВИДАХ СПОРТА ........ 195

*Малевич В. Г.* МЕТОДОЛОГИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО КЛАСТЕРА В СИСТЕМЕ ПОДГОТОВКИ МАГИСТРОВ ........ 201

*Міхайлава А. Л.* СУТНАСЦЬ І ЗМЕСТ ПАНЯЦЦЯ «ЭТНАКУЛЬТУРА» Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАГА ЭТАПУ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ ........ 206

*Морозова Н. Н.* К ОСМЫСЛЕНИЮ ИННОВАЦИОННЫХ ПРОЦЕССОВ ОБУЧЕНИЯ СПЕЦИАЛИСТОВ ПО ЭКОНОМИЧЕСКОМУ ПРОФИЛЮ С ЭЛЕМЕНТАМИ АНГЛИЙСКОГО ЯЗЫКА ........ 214

*Налецкая Т. Н.* СОДЕЙСТВИЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОМУ САМООПРЕДЕЛЕНИЮ СТУДЕНТОВ КАК СРЕДСТВО ПОВЫШЕНИЯ УРОВНЯ ПОДГОТОВКИ БУХГАЛТЕРОВ ........ 223

*Ножка И. А., Шило О. В.* ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ МОДЕЛЬ ФОРМИРОВАНИЯ СОЦИАЛЬНО-ЛИЧНОСТНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ СТУДЕНТОК ПОСРЕДСТВОМ ЧЕРЛИДИНГА ........ 230

*Панов С. В.* ИСТОРИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ КАК ИНСТИТУЦИОНАЛЬНАЯ СИСТЕМА И СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ ФЕНОМЕН ........ 238

*Федосова А. А.* НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ УЧРЕЖДЕНИЙ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ КАК ОБЪЕКТ БИБЛИОТЕКОВЕДЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ ........ 244

*Филимонова Н. И., Трищина Т. И.* АНАЛИЗ ИСХОДНОГО УРОВНЯ ГОТОВНОСТИ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ К ОСУЩЕСТВЛЕНИЮ ФИЗИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ В УСЛОВИЯХ ИНКЛЮЗИВНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ........ 252

*Яценко Т. Е.* СОДЕРЖАТЕЛЬНЫЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ЭМПАТИИ ПЕДАГОГОВ-ЖЕНЩИН ОБЩЕОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ И ДОШКОЛЬНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ ........ 260